З каталіцкіх СМІ Беларусі (17)

Аўтар: Рэдакцыя
12.09.2021 00:00

25 жніўня пры кляштары францысканцаў у Івянцы прайшоў дзень засяроджання для маладых братоў і сясцёр з манаскіх супольнасцей Беларусі. Сёлетняя сустрэча праходзіла пад дэвізам “Вы – соль зямлі (Мц 5, 13)” і была прысвечана каштоўнасці і ролі манаскага жыцця.

Падчас сустрэчы біскуп Аляксандр Яшэўскі SDB нагадаў, што прыклад кансэкраванага жыцця даў сам Езус Хрыстус, які жыў ва ўбостве, чысціні і паслухмянасці. Таму, на думку пастыра, манаскае жыццё заключаецца менавіта ў тым, каб мець такі стыль жыцця, які меў Хрыстос, бо перад кансэкраванымі асобамі стаіць задача не дапусціць, каб людзі забыліся пра ухоўную сферу існавання чалавека.†

Юбілейная 5-ая школа міністрантаў прайшла ў парафіі Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі ў Верхнядзвінску напрыканцы лета. Традыцыйна тры дні хлопцы мелі магчымасць аднавіць і ўзбагаціць свае веды па тэорыі і практыцы літургікі, супольна памаліцца падчас св. Імшы і адарацыі Найсвяцейшага Сакраманту, а таксама пабавіць час, гуляючы ў настольны тэніс і футбол.

Асаблівасцю сёлетняй сустрэчы стаў курс цесляра, на якім хлопцы самастойна рабілі ружанцы. Спачатку выточвалі драўляныя пацеркі на станку, потым выпільвалі электралобзікам крыжыкі, а пасля шліфоўкі звязвалі ўсе дэталі ў паўнавартасную “таямнічку”. Гатовыя ружанцы адразу ж былі выкарыстаны на малітве падчас адарацыі.

У верасні Папа заклікае маліцца аб тым, каб людзі зрабілі выбар на карысць экалагічна ўраўнаважанага стылю жыцця. Ён просіць падумаць пра наш лад жыцця, асабліва ў цяперашні час крызісу, які ахапіў сферы аховы здароўя, грамадства і экалогіі. “Падумаем пра тое, як мы харчуемся, спажываем, перасоўваемся ці выкарыстоўваем ваду, энергію,

пластмасу і многія іншыя матэрыяльныя даброты, што нярэдка наносіць шкоду Зямлі. Давайце зробім выбар на карысць перамен! Давайце ісці разам да больш простага і экалагічнага ладу жыцця", – заахвоціў Святы Айцец.

Пантыфік падкрэсліў, што моладзь знаходзіцца ў авангардзе, што тычыцца клопату пра планету, і заахвоціў следаваць яе прыкладу.



30 жніўня ў рэктаральным касцёле Звеставанне Найсвяцейшай Панны Марыі (пабрыгіцкі) у Гродне адбылася сустрэча катэхетаў, якія служаць на тэрыторыі Гродзенскай дыяцэзіі. Ёю быў урачыста адкрыты катэхетычны год у дыяцэзіі.

На сустрэчы сабралася больш за 50 катэхетаў: святары, манаскія сёстры, свецкія асобы. Прысутныя выслухалі дзве канферэнцыі, удзельнічалі ў малітве перад Найсвяцейшым Сакрамантам і ў св. Імшы.

Асаблівым чынам была адзначана важнасць прабывання з маладымі людзьмі.